*Комсамольскае жыццё*

# СПРАВА ВЯЛІКАЯ І АДКАЗНАЯ

Абмен комсамольскіх дакументаў, які будзе праводзіцца з 1 студзеня 1956 года, патрабуе вялікай падрыхтоўчай работы. Своечасова і арганізавана пачалі праводзіць гэтую работу комсамольскія арганізацыі філалагічнага факультэта (сакратар комсамольскага бюро Н. Рожын), геолага-геаграфічнага факультэта (сакратар камсамольскага бюро А. Хоміч) і іншыя. Але гэта толькі пачатак. Прадстаіць яшчэ больш напружаная і крапатлівая работа, якая патрабуе ад комсамольскіх кіраўнікоў вялікай актыўнасці і ўвагі.

Выклікае трывогу становішча спраў у комсамольскіх арганізацыях фізіка-матэматычнага факультэта, аддзялення журналістыкі, юрыдычнага і біёлага-глебавага факультэтаў. Падрыхтоўчая работа ў гэтых комсамольскіх арганізацыях абмяжоўваецца пакуль складаннем дакладных спісаў комсамольцаў. Тут яшчэ няма сапраўднай работы па навядзенню належнага парадку ў комсамольскай гаспадарцы.

Да абмену комсамольскіх дакументаў засталося менш двух месяцаў, а зроблена яшчэ вельмі мала. У самы кароткі тэрмін неабходна правесці строгі ўчот і прыняць усе меры для адшукання комсамольцаў, якія выбылі з арганізацыі, але не зняліся з учоту. Адначасова трэба паклапаціцца аб тым, каб усе комсамольцы першых курсаў у бліжэйшыя дні сталі на ўчот.

У комсамольскай арганізацыі універсітэта састаіць па ўчоце многа комсамольцаў, якім ужо звыш 26 год. Факультэцкім і курсавым комсамольскім бюро трэба на працягу лістапада месяца, згодна Статута ВЛКСМ, аформіць падоўжанне тэрміну прабывання ў комсамоле тым таварышам, якія жадаюць застацца ў комсамоле і прыняць самы актыўны ўдзел у рабоце арганізацыі. Тыя-ж, якія не жадаюць заставацца ў комсамоле, павінны падаць у комсамольскую арганізацыю заяву аб зняцці іх з комсамольскага ўчота.

Ва ўсёй гэтай рабоце нельга дапускаць шкоднай паспешлівасці, якая звычайна стварае неразбярыху і блытаніну. Комсамольскія работнікі павінны праявіць максімум увагі і клопатаў да кожнага члена ВЛКСМ.

У падрыхтоўчай рабоце да абмену комсамольскіх дакументаў вялікую ўвагу трэба звярнуць на ліквідацыю запазычанасці па членскіх узносах. У комсамольскіх арганізацыях фізіка-матэматычнага і гістарычнага факультэтаў прадаўжаюць існаваць факты парушэння інструкцыі ўплаты членскіх узносаў. Бываюць выпадкі, калі сакратар комсамольскага бюро курса збірае ўзносы, а адпаведнай адзнакі ў комсамольскім білеце не робіць. Так, напрыклад, на фізіка-матэматычным факультэце ёсць студэнты, у якіх у комсамольскіх білетах няма адзнакі аб уплаце членскіх узносаў за чатыры і болей месяцаў. Былы студэнт V курса аддзялення фізікі Віктар Буракоў не меў адзнак у комсамольскім білеце з верасня 1953 года!

Многія комсамольцы не маюць адзнак у білетах толькі таму, што да іх патрэбны ўклады. А групоргаў гэта чамусьці зусім не цікавіць. Такое становішча больш нецярпіма. Сакратары комсамольскіх арганізацый факультэтаў абавязаны ў бліжэйшыя дні скласці спісы комсамольцаў, якім патрэбны ў комсамольскія білеты ўклады, і даставіць гэтыя спісы ў камітэт ЛКСМБ.

Не менш важнае значэнне ў падрыхтоўчай рабоце да абмену комсамольскіх дакументаў павінна належаць тэхнічнаму боку справы. Ліквідацыя недахопаў і запушчанасці ва ўчоце членаў ВЛКСМ патрабуе сур'ёзных адносін кожнага комсамольца да гэтай работы. Ёсць выпадкі разыходжання даных, запісаных у комсамольскіх дакументах, і агульных. Па невядомых прычынах прозвішчы, імёны або год нараджэння некаторых комсамольцаў у дакументах часамі скажаюцца. Так, напрыклад, на ўчоце ў комсамольскай арганізацыі філалагічнага факультэта (1 курс аддзялення рускай мовы і літаратуры) састаіць Маслоўская Яўгенія Віктараўна, а ў аддзеле кадраў значыцца Маслоўская Джэні Віктараўна. У комсамольскім білеце студэнта гістарычнага факультэта Р. Астрэйкі запісан год нараджэння 1933, а ў пашпарце—1934.

Падрыхтоўчая работа да абмену комсамольскіх білетаў і ўчотных картак павінна вырашыць многія важныя пытанні комсамольскага жыцця на факультэтах і ў групах. Нельга лічыць нармальным, калі некаторыя комсамольцы па некалькі гадоў носяць комсамольскія спагнанні, хаця даўно ўжо заслужылі іх зняцця. Гэты важнейшы ўчастак выхаваўчай работы павінен пастаянна знаходзіцца ў цэнтры ўвагі комсамольскай арганізацыі.

**В. САЛАШЭНКА,**
**намеснік сакратара камітэта ЛКСМБ БДУ.**

# Калі адсутнічае пачуццё адказнасці

Была ўжо чацвёртая гадзіна ночы, калі з Пухавіч у Мінск вярнуўся з чарговых «гастроляў» тэатральны калектыў нашага універсітэта. Парушаючы гулам матора начную цішыню, ва універсітэцкі гарадок заехала грузавая аўтамашына і спынілася ля бійкорпуса. З кузава, аглядаючыся, вылез студэнт Внукаў і, падышоўшы да свайго таварыша, сказаў:

— Хадзем пагаворым па душах.

Лукашэвіч ахвотна згадзіўся. Але ніякай гутаркі паміж імі не адбылося. Ледзь толькі яны апынуліся на цёмнай алеі сквера, як Внукаў выхапіў нож і ўдарыў ім у грудзі Лукашэвіча.

Хто ён, гэты злачынец? Дзе ён выхоўваўся? Хто яго сябры? Уладзімір Внукаў—студэнт юрыдычнага факультэта. Актыўны ўдзельнік мастацкай самадзейнасці. Вось і ўсё, што могуць сказаць аб ім яго аднакурснікі, таварышы па тэатральнаму калектыву. Праўда, к гэтаму яшчэ дадаюць, што ён часам можа абразіць чалавека, абляць любога студэнта пахабным словам. Але гэтыя і іншыя недахопы лічаць у калектыве «дробязямі», а таму ніхто на іх не звяртае ўвагі. Некаторыя нават лічаць Внукава «высокародным» чалавекам, «душой» калектыва. І вось гэты «высокародны» чалавек пайшоў ноччу ў сквер і ўдарыў нажом свайго таварыша.

Ганебны ўчынак панажоўшчыны не з'яўляецца выпадковым. Гэта вынік дрэннай выхаваўчай работы ў тэатральным калектыве. Усяму калектыву было вядома, што Внукаву ўласцівы адмоўныя рысы, але ніхто не надаваў гэтаму належнай увагі. Усё было-б інакш, калі-б таварышы своечасова змаглі аказаць добры ўплыў на Внукава. Але атрымалася так, што тэатральны калектыў жыў сам па сабе, а Внукаў — сам па сабе. Ці мог так паступіць, як паступіў Внукаў, чалавек, выхаваны ў духу высокай маралі, які навучыўся паважаць людзей, комсамолец у поўным сэнсе гэтага слова? Калі-б у калектыве вялася выхаваўчая работа, калі-б кожны яго ўдзельнік змагаўся за высокае маральнае абліччча з сапраўдным запалам і непрымірымасцю, можна з упэўненасцю сказаць, што не здарылася-б і падобнага ўчынка.

Неад'емная рыса пераважнай большасці совецкіх людзей — глыбокая зацікаўленасць да лёсу таварыша, пачуццё адказнасці за яго паводзіны, непрымірымасць да амаральных учынкаў. Але бяда ў тым, што ў нашым асяроддзі ёсць яшчэ студэнты, якія гэтую зацікаўленасць разумеюць не ўсім правільна, аднабакова. Зробіць хто-небудзь амаральны ўчынак і абавязкова ў яго знойдуцца абаронцы, якія з пенай на вуснах будуць даказваць, апраўдваць...

На гэты раз у незавіднай ролі заўзятых абаронцаў Внукава выступілі студэнткі Рыма Маленчанка і Галя Кандрашова. Апраўдваючы Внукава, яны сталі на шлях падману сваіх таварышаў, калектыва. У ход былі пушчаны ўсе хітрыкі, адна версія змянялася другой. Ніводнага шчырага слова. Дзе-ж тут комсамольскі гонар? Дзе-ж чалавечае сумленне?

Няма нічога больш ганебнага, агіднага, чым ашукванне свайго калектыва. Правільна паступіў камітэт комсамола універсітэта, які строга пакараў не толькі Внукава, які зрабіў злачынства, але і тых, хто імкнуўся пакрыць яго.

І больш за ўсё здзіўляе тое, што ні Р. Маленчанка, ні Г. Кандрашова так і не зразумелі і не хочуць зразумець, што яны сваёй паблажлівасцю, сваімі паводзінамі не толькі пакрываюць і выгароджваюць Внукава, але патураюць хуліганам наогул. Яны не хочуць зразумець, што сваімі словамі, дзеяннямі яны «натхняюць» хуліганаў і розных прахадзімцаў, якія ўсё яшчэ, на вялікі жаль, сустракаюцца ў нашым грамадстве.

Не на належным узроўні аказаўся і мастацкі кіраўнік тэатральнага калектыва Кузьма Львовіч Рутштэйн. Больш за 20 год ён прысвяціў рабоце ў мастацкай самадзейнасці. Многа ўмення, майстэрства, упорства ўклаў гэты працавіты чалавек, каб стварыць цэлы рад удалых спектакляў сіламі самадзейнага калектыва. Аслеплены дасягнутымі поспехамі, тав. Рутштэйн зусім закінуў выхаваўчую работу, не заўважаў таго, што многія члены тэатральнага калектыва заразіліся чужой мараллю, папалі пад дрэнны ўплыў. У калектыве зусім адсутнічала прынцыповая комсамольская крытыка. Уся работа будавалася і праходзіла ў будзённых справах і крыклівых поспехах. Вось гэтыя беспрынцыповасць, зазнайства, паблажлівыя адносіны да недахопаў асобных таварышаў, непатрэбнае захапленне ўяўнай здольнасцю некаторых удзельнікаў спарадзілі ў тэатральным калектыве чужую мараль, шкоднае самалюбаванне і індывідуалізм.

Ці толькі Внукаў павінен несці адказнасць за зробленае злачынства? Ці не вінаваты ў гэтым яго сябры, якія ведалі аб тым, што паміж Внукавым і Лукашэвічам склаліся нядобрыя адносіны, якія могуць прывесці да бойкі? Што зрабілі яны, каб прадухіліць яе? Нават і пальцам не варухнулі. Не дапамог яму выйсці на правільны шлях і яго лепшы сябра, старшы таварыш—аспірант Тамільчык. Аб тым, што паміж Внукавым і Лукашэвічам можа адбыцца бойка, ведаў і тав. Рутштэйн. Але замест таго, каб прыкаваць да гэтага ўвагу ўсяго калектыва, тав. Рутштэйн абмежаваўся простай заўвагай у адрас Внукава. А таварыш Рутштэйн ведаў-жа Внукава як несумленнага студэнта, няўроўнаважанага і лёгкадумнага, які лічыў сябе вельмі здольным акторам. Так пры патуранні кіраўніка і маўклівай згодзе ўсяго калектыва было зроблена злачынства.

Некалькі дзён назад гэты выпадак абмяркоўваўся на расшыраным пасяджэнні камітэта комсамола. Комсамольскі актыў строга асудзіў не толькі Внукава, але і Маленчанка, Кандрашову, Тамільчыка, якія ў той або іншай ступені з'явіліся натхняльнікамі гэтай бойкі. Усе яны рашэннем камітэта комсамола выключаны з радоў ВЛКСМ. Зусім правільна паступіў камітэт, сурова пакараўшы злачынцу і яго заступнікаў.

Але цяпер хочацца сказаць аб іншым. Ці дасягнуў камітэт комсамола той мэты, якую ён ставіў перад сабой? Пакараць-жа таго ці іншага комсамольца — гэта толькі адзін бок справы. Не менш важна, каб віноўны зразумеў усю агіднасць свайго ўчынку. Ці зразумелі Маленчанка і Кандрашова, што яны паступілі не па-комсамольску? Пакуль што не. Яны і на сённяшні дзень лічаць, што паступілі правільна, і для іх Внукаў застаецца «высокародным» чалавекам і «душой» калектыва. Камітэт комсамола не змог дастаткова глыбока прааналізаваць работу тэатральнага калектыва і на аснове гэтага зрабіць сур'ёзныя вывады. Даўно пара пакончыць з палітыкай няўмяшання камітэта комсамола ў работу гурткоў мастацкай самадзейнасці. Тут таксама, як і ў іншых групах, рашаючая роля павінна належаць комсамолу, закліканаму ахоўваць нашу моладзь ад чужых уплываў, выхоўваць яе ў комуністычным духу.

**Р. ТКАЧУК.**

Насустрач спартакіядзе народаў СССР

# ДА НОВЫХ СПАРТЫЎНЫХ ПОСПЕХАЎ!

Новым яркім праяўленнем клопатаў партыі і ўрада аб развіцці фізічнай культуры і спорту ў краіне з'яўляецца рашэнне аб правядзенні ў ліпені-жніўні 1956 года ў Маскве спартакіяды народаў СССР.

На спартакіядзе будзе разыграна першынство паміж камандамі саюзных рэспублік, Масквы і Ленінграда па 20 асноўных відах спорту. Удзельнічаць у спаборніцтвах будуць да 10 тысяч спартсменаў.

Зборныя каманды спартсменаў саюзных рэспублік і гарадоў Масквы і Ленінграда будуць аспрэчваць устаноўленыя Советам Міністраў СССР прызы, якімі будуць узнагароджаны калектывы, заняўшыя ў розыгрышы агульнакамандае першынство, першае, другое і трэцяе месцы. Акрамя гэтага павінны разыграць таксама прызы Камітэта па фізічнай культуры і спорту пры Совеце Міністраў СССР па ўсіх відах спорту, што ўваходзяць у праграму спартакіяды.

У лік важнейшых задач, якія стаяць перад нашай фізкультурнай арганізацыяй у працэсе падрыхтоўкі да спартакіяды народаў СССР, уваходзіць арганізацыйнае ўмацаванне калектыва фізкультуры і іх кіруючых органаў (Совета і бюро факультэтаў). Узначальваць фізкультурную работу калектыва і бюро факультэтаў павінны студэнты, якія маюць вопыт комсамольскай работы, якія любяць спорт.

Неабходна адзначыць, што да апошняга часу нашы грамадскія арганізацыі універсітэта мелі пэўную тэндэнцыю—лепшых актывістаў і арганізатараў вылучаць на любую грамадскую работу, але толькі не на фізкультурную. Як вынік, гэта прывяло да таго, што рад факультэтаў, як філалагічны, юрыдычны, біялагічны, не спраўляюцца з тымі вялікімі задачамі, якія стаяць перад імі ў справе развіцця спартыўна-масавай работы, пусцілі гэты ўчастак работы на самацёк, што пацвярджаюць вынікі круглагадовай спартакіяды. У апошні год значна паслабіў фізкультурную работу і фізіка-матэматычны факультэт, хаця ён мае ўсе магчымасці быць лепшым калектывам.

У гэтым навучальным годзе кафедра фізічнага выхавання і спорту будзе культывіраваць больш 20 відаў спорту. Пачалі ўжо работу секцыі па спартыўнай гімнастыцы, мастацкай гімнастыцы, плаванню, валейболу, баскетболу, лыжнаму і веласіпеднаму спорту, класічнай барацьбе, шахматах, футболу, лёгкай атлетыцы і г. д. Работу секцый узначальваюць кваліфікаваныя выкладчыкі і трэнеры, якія маюць вялікі вопыт работы. Рэктарат і кафедра фізічнага выхавання стараюцца стварыць максімальныя ўмовы для работы секцый. Арандаваны зімовы басейн для плавання. Секцыя класічнай барацьбы будзе праводзіць свае заняткі ў добра абсталяванай зале ДСТ «Будаўнік». Стаіць пытанне аб правядзенні заняткаў зборных каманд універсітэта па баскетболу і валейболу ў ігравой зале «Дынамо».

У сучасны момант кожны факультэт павінен накіраваць максімальны лік студэнтаў у агульнауніверсітэцкія секцыі, а па раду відаў спорту—лёгкай атлетыцы, лыжнаму спорту, іграх, шахматах, шашках, стральбе—арганізаваць свае секцыі і каманды, прымацаваўшы да іх лепшых сваіх спартсменаў, многія з якіх прайшлі семінары грамадскіх інструктараў. Толькі пры такой пастаноўцы справы мы зможам вырашыць пытанне аб сапраўды масавым развіцці спорту сярод студэнцкага калектыва нашай навучальнай установы.

У гэтым навучальным годзе кафедра фізічнага выхавання і спорту сумесна з советам калектыва фізкультуры плануе правесці рад спаборніцтваў па розных відах спорту, што ў значнай ступені павінна садзейнічаць росту спартыўных дасягненняў. Толькі ў першым паўгоддзі іх будзе праведзена звыш 30.

Будзе праведзена 4-я круглагадовая спартакіяда па 11 відах спорту, прысвечаная спартакіядзе народаў СССР. У параўнанні з мінулым годам мы значна ўзнялі патрабаванні да падрыхтоўкі ўдзельнікаў спаборніцтва. Упершыню ў праграму спартакіяды ўключаны спаборніцтвы па фехтаванню. Рашэннем кафедры і совета калектыва фізкультуры усе рэкорды універсітэта будуць фіксіравацца не ніжэй трэцяга разрада.

Да сучаснага моманту ў нас прыкметна адставанне па лёгкай атлетыцы, асабліва ў жанчын, дзе многія вынікі з'яўляюцца крайне нізкімі. Яшчэ горш абстаіць справа ў канькабежным спорце. Не радуюць нас і справы па плаванню ў жанчын, многія не перавышаюць трэцяга разрада.

Выкладчыкі кафедры і трэнеры па відах спорту дадуць кожнаму ўдзельніку персанальныя заданні, што ў значнай ступені будзе садзейнічаць асабістай зацікаўленасці кожнага спартсмена і дасць магчымасць больш строга правяраць ход вучэбна-трэніровачнага працэсу.

На факультэтах павінны быць праведзены конкурсы на лепшую пастаноўку фізкультурнай работы, вынікі якіх будуць падведзены ў канцы 1955 года. Многія факультэты яшчэ не разлічыліся па збору членскіх узносаў, слаба вядуць агітацыю і прапаганду спорту. На фізіка-матэматычным і хімічным факультэтах насценныя газеты ў мінулым навучальным годзе выходзілі дрэнна афармлены і бедныя па зместу. Многа лепшага жадае афармленне фота-стэндаў. На факультэтах не вывешваліся вынікі ходу круглагадовай спартакіяды і выканання кантрольных заданняў па падрыхтоўцы спартсменаў-разраднікаў. Мала праводзілася фізкультурных вечароў. Факультэтам неабходна цяпер прыняць канкрэтныя меры для выканання ўсіх раздзелаў работ, прадугледжаных аглядам-конкурсам, што ў значнай ступені палепшыць пастаноўку спартыўна-масавай і арганізацыйнай работы ў цэлым па універсітэту.

1955—1956 навучальны год будзе насычан радам буйных гарадскіх і рэспубліканскіх спаборніцтваў, у якіх прымуць удзел каманды універсітэта. Фіналам работы ВНУ, як і ў мінулым годзе, з'явіцца другая рэспубліканская спартакіяда па зімовых і летніх відах спорту. Нам трэба смялей і ў больш шырокіх маштабах арганізоўваць заняткі зімой на паветры па многіх так званых летніх відах спорту; неабходна ўдзяліць больш увагі агульнай фізічнай падрыхтоўцы, чаго так часта не хапае нават нашым вядучым спартсменам. Асабліва гэты недахоп адчуваецца ў плаўцоў, баскетбалістаў і валейбалістаў, якія часта не могуць вытрымаць працяглае фізічнае напружанне ў час спаборніцтваў.

Няма ніякага сумнення ў тым, што пры дапамозе рэктарата, партыйнай і грамадскіх арганізацый універсітэта мы справімся з задачамі, якія стаяць перад нашай фізкультурнай арганізацыяй і сустрэнем Спартакіяду народаў СССР новымі поспехамі ў пастаноўцы спартыўна-масавай работы сярод студэнцкага калектыва нашай навучальнай установы.

**Е. МАРКАЎ**
**заг. кафедрай фізічнага выхавання і спорту.**

# УЗНЯЦЬ РАБОТУ СНТ

Важную ролю у ВНУ іграюць навукова-даследчыя студэнцкія гурткі. Работа ў іх дапамагае не толькі расшырэнню агульнага і прафесіянальнага кругагляду, але і прывучае да самастойнага разумення тых або іншых праблем. Для студэнтаў-філолагаў яна важная і тым, што пад кіраўніцтвам кваліфікаваных выкладчыкаў студэнты атрымліваюць навыкі самастойнага аналізу мастацкіх твораў і моўных з'яў, расшыраюць свае тэарэтычныя веды.

Здавалася-б, што і дэканат, і грамадскія арганізацыі павінны паставіць гэтую работу на высокі ўзровень. Але вось ужо некалькі гадоў у друку, на сходах і канферэнцыях філалагічны факультэт не раз справядліва крытыкавалі за нізкі ўзровень работы студэнцкіх навукова-даследчых гурткоў.

У мінулым навучальным годзе з'явіліся прыкметныя зрухі. Гэта відаць, у першую чаргу, з вынікаў гарадскога агляду навукова-даследчых студэнцкіх работ. Дастаткова ўказаць хаця-б на тое, што на агляд было прадстаўлена 60 работ, з якіх 31 работа атрымала першую катэгорыю, супраць 34 работ за 1954 год, з якіх 14 работ было першай катэгорыі.

Асабліва прыкметна палепшылася работа на кафедры рускай літаратуры (заг. кафедрай праф. І. В. Гутараў). Гэтай кафедрай было прадстаўлена на агляд на 16 работ больш, чым у 1954 годзе. Трэба заўважыць, што і па сваёй важнасці работы, прадстаўленыя на агляд у 1955 годзе, адрозніваюцца ў лепшы бок. У тэматыцы прадстаўленых работ пераважаюць даследаванні студэнтаў аб мастацкім майстэрстве пісьменнікаў. Студэнты С. Кліменка, В. Бугаева, І. Кісялёва і іншыя не адзін год займаюцца ў гуртках па рускай літаратуры, і іх работы былі высока ацэнены на аглядзе.

Цікавай была работа гуртка замежнай літаратуры, якім кіруе дацэнт Д. Е. Фактаровіч. Кафедра замежнай літаратуры займаецца распрацоўкай важнай праблемы—станаўлення соцыялістычнага рэалізма ў літаратурах замежных краін.

Абмеркаванне дакладаў у гэтым гуртку носіць заўсёды творчы характар і таму прыцягвае ўвагу студэнтаў усіх курсаў.

Аднак дасягнутыя поспехі ні ў якім разе не павінны засланяць тыя недахопы, з якімі яшчэ мірацца грамадскія арганізацыі факультэта. Калі кафедрамі рускай і замежнай літаратуры нядрэнна арганізуецца навукова-даследчая работа студэнтаў, то на астатніх кафедрах, за выключэннем кафедры беларускай мовы, гэтая работа, відавочна, у перспектыўным плане. Асабліва дрэнна вялася работа кафедрай беларускай літаратуры. У гуртку па беларускай совецкай літаратуры, якім кіраваў Ю. С. Пшыркоў, цэлы год адбывалася ігра ў хованкі: то студэнты шукалі кіраўніка, то кіраўнік не мог знайсці студэнтаў і пры гэтым разводзіў толькі рукамі: «Вось, нічога не магу зрабіць, калі студэнты не хочуць працаваць».

Неабходна, каб у гэтым навучальным годзе гэтай справай па-сапраўднаму занялася кафедра беларускай літаратуры (заг. кафедрай дацэнт М. Г. Ларчанка) Аб жаданні-ж студэнтаў працаваць у гэтым гуртку гаворыць ужо той факт, што з першых дзён навучальнага года ў яго запісалася больш за 40 чалавек.

Вялікі план работы складаецца штогод у гуртку журналістыкі (кіраўнік—дацэнт М. С. Зярніцкі), але вынікі работы вельмі дрэнныя: так, на агляд студэнцкіх навуковых работ было прадстаўлена ўсяго тры работы. А поле дзейнасці гэтага гуртка—бязмежнае.

І ў гуртку журналістыкі, і ў гуртку совецкай літаратуры амаль не практыкуецца напісанне літаратурных рэцэнзій. А філолаг-жа павінен умець ацаніць той або іншы мастацкі твор, які вышаў з друку.

Буйным недахопам у рабоце літаратурных гурткоў з'яўляецца і тое, што ў іх зусім не займаюцца праблемамі марксісцка-ленінскай эстэтыкі і тэорыі літаратуры. А распрацоўка гэтых праблем адыграла-б неацанімую ролю ў разуменні ўсяго літаратурнага працэсу.

Некалькі слоў аб гуртках, работай якіх кіруе кафедра рускай мовы і агульнага мовазнаўства (заг. кафедрай дац. А. Я. Бірала). Там ужо некалькі год заўважаецца таптанне на месцы, якое між іншым сцвярджаецца спецыяльным рашэннем кафедры прадставіць на агляд 4 работы. У гэтым годзе кафедрай, нягледзячы на намечаны план, было прадстаўлена 6 работ, але яны аказаліся ніжэй мінулагодніх па якасці (толькі адна работа аднесена да першай катэгорыі). А шкада! Праблемамі мовазнаўства і мовай мастацкіх твораў з цікавасцю займаліся-б многія студэнты-філолагі, калі-б іх работу ўмела накіроўвалі і з любоўю да справы, а не кіравалі-б ёй толькі па абавязку службы.

Кіраваць навукова-даследчай работай студэнтаў, арганізоўваць і кантраляваць яе павінны не толькі кафедры і дэканат, а і комсамольскія арганізацыі. Але ў комсамольскіх органах, у прыватнасці, філалагічнага факультэта, лічаць гэта другараднай справай і займаюцца ёй ад выпадку да выпадку. Асабліва дзіўна тое, што для заняткаў гурткоў мастацкай самадзейнасці, напрыклад, адведзены спецыяльныя дні, а навукова-даследчыя гурткі могуць займацца ў любы час. А такога часу ніколі і не аказваецца, бо ўся грамадская работа спланавана-ж, а такой, як навукова-даследчая, у плане няма. Значыць, яна павінна ісці самацёкам.

На філалагічным факультэце яна і ідзе самацёкам.

А ці не лепш было-б устанавіць адзіны дзень для работы навукова-даследчых гурткоў? Для вырашэння гэтай «складанай» задачы не трэба, як здаецца, стварэння спецыяльнай камісіі. Варта толькі падумаць больш сур'ёзна аб тым, што навукова-даследчая работа студэнтаў — найважнейшы ўчастак работы комсамольскай арганізацыі, а не толькі кафедраў і рэктарата. Умелая арганізацыя яе і была-б сапраўднай дапамогай рэктарату і партыйнай арганізацыі ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў.

**І. ПІСАРЭНКА,**
**старшыня совета СНТ філалагічнага факультэта.**

# КУЛЬТПАХОД СТУДЭНТАЎ

Студэнты другога курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры арганізавалі культпаход на кінофільм «Да новага берага». Пасля прагляду кінофільма адбылося яго абмеркаванне. Студэнт К. Свёкла спыніўся на станоўчых і адмоўных баках фільма. Асабліва гарачыя спрэчкі разгарнуліся вакол вобраза героя фільма—Айвара. Выступіўшыя студэнты Слагада, Маз і Вінцэвіч выказалі свае думкі аб Айвары. Студэнты адзначылі таксама і недахопы, якія ёсць у кінофільме.

**А. ЛАЗОЎСКІ,**

# АБ АДНЫМ ВЫСТУПЛЕННІ „СТАЛИНСКОЙ МОЛОДЕЖИ"

Газета «Сталинская молодежь» у заметцы, пад загалоўкам «Находки студенческой газеты», падвергла крытыцы артыкул «Яўген знаходзіць сваё месца», апублікаваны шматтыражнай газетай «Беларускі універсітэт». Сапраўды, артыкул, аб якім ідзе размова, заслугоўвае крытыкі, бо стылістычна ён недапрацаваны, ды і фактычных недакладнасцей у ім нямала.

Але справа не толькі ў гэтым артыкуле. Крытыкуемы артыкул аўтар заметкі, студэнт універсітэта А. Герус, пры маўклівай згодзе і адабрэнні «Сталинской молодёжи», выкарыстаў для таго, каб бяздоказна ахаяць увесь нумар газеты «Беларускі універсітэт», зрабіць недапушчальны выпад супраць яе рэдактара тав. Шацілы. «Вывад са сказанага сам сабой напрошваецца,—піша А. Герус,—рэдактар газеты т. Шаціла аказаўся яўна не на сваім месцы».

У чым-жа справа? А разгадка, аказваецца, простая. На чацвертай старонцы ахаянага Герусам нумара універсітэцкай шматтыражкі апублікаван фельетон «Імяніннікі». Фельетон выкрывае «герояў» адной п'янкі з дэбошам, у якой прынялі ўдзел асобныя студэнты універсітэта і, у прыватнасці, Анатоль Герус—аўтар заметкі ў «Сталинской молодёжи». Акрамя таго, фельетон выкрываў А. Геруса як нядобрасумленнага аўтара, халтуршчыка. Вось дзе корані творчага натхнення Геруса!

Супрацоўнікі газеты «Сталинская молодежь», прачытаўшы артыкул на другой старонцы, не палічылі патрэбным заглянуць на чацвертую, хаця гаворка ідзе пра ўвесь нумар, і гэтым самым дапамаглі з'явіцца бестактоўнай халтурнай заметцы А. Геруса.

**(«СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ» № 250 ад 21 кастрычніка.)**

## *ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕНЯЎ*

У № 18 нашай газеты быў змешчан фельетон пад назвай «Імяніннікі». У ім расказвалася аб амаральных паводзінах студэнта III курса аддзялення журналістыкі Э. Чэчко і яго аднакурснікаў—Г. Кузьмічэнка, Н. Бандарэнка, А. Фомчанка і А. Геруса.

Фельетон «Імяніннікі» абмяркоўваўся на комсамольскім сходзе курса. Паводзіны Э. Чэчко былі рэзка асуджаны таварышамі-аднакурснікамі. Сход прыняў рашэнне прасіць рэктарат вынесці студэнту Э. Чэчко суровую вымову з апошнім папярэджаннем.

Рэзкай крытыцы былі падвергнуты на сходзе таксама студэнты А. Фомчанка, А. Герус, Г. Кузьмічэнка і Н. Бандарэнка.



**На здымку:** студэнткі—удзельніцы секцыі гімнастыкі на занятках развучваюць новае практыкаванне.

**Фото Л. БОНДАРА.**

# У СТАМБУЛЕ

**З 19 па 24 верасня ў Стамбуле адбылася другая канферэнцыя Міжнароднай асацыяцыі універсітэтаў, у рабоце якой прымаў удзел рэктар БДУ імя В. І. Леніна, прафесар К. І. Лукашоў.**

**Турэцкі ўрад, а таксама і камітэт па падрыхтоўцы канферэнцыі на чале з былым рэктарам Стамбульскага універсітэта доктарам медыцынскіх навук Саглам, стварылі неабходныя ўмовы для работы канферэнцыі.**

**Совецкія дэлегаты атрымалі магчымасць пазнаёміцца з горадам, наведаць буйнейшыя прамысловыя прадпрыемствы, навучальныя і культурныя ўстановы горада Стамбула.**

**Ніжэй друкуецца расказ К. І. Лукашова аб паездцы ў Турцыю.**

* * *

У былую сталіцу Турцыі—Стамбул—мы ляцелі праз Прагу, Парыж, Неапаль, Рым, Афіны. Увечары 18 верасня прыбылі на аэрадром Эшэлкёе, размешчаны ў 20 кіламетрах на поўнач ад Стамбула. Эшэлкёе—найбольш буйны аэрадром у Турцыі. Ён прыстасаван да прыёму ўсіх класаў сучасных самалётаў і шырока выкарыстоўваецца як транзітны шлях для паветраных зносін з Бліжнім Усходам, Афрыкай і Еўропай.

Горад раскінуўся па абодвух берагах праліва Басфора пры яго зліянні з Мрамарным морам. Гарадская мяжа Стамбула ўключае тэрыторыю ад Анадалу Кавака і Румелі Кавака на поўначы, да Едзікуле на захадзе і Пендзіка на ўсходзе. У склад горада ўваходзяць таксама Прынцавы астравы (Кызаладалар) і горад Ялова.

Стамбул займае 535 кв. кіламетраў. Ён складаецца з еўрапейскай і азіяцкай частак. Еўрапейская частка горада падзяляецца на дзве палавіны залівам Залаты Рог. Частка горада на поўдзень ад заліва Залаты Рог называецца Стамбулам, а другая частка горада, што на поўнач,—Бейоглу. Стамбул злучан з Бейоглу двума жалезнымі мастамі —Галацкім і Атацюрка.

Частка цяперашняга горада, называемая Стамбулам, была пабудавана ў 658 годзе да нашай эры грэкамі. У 326 годзе новай эры па загаду імператара Канстанціна горад стаў адбудоўвацца. Праз чатыры гады ён быў абъяўлен сталіцай Усходняй Рымскай (Візантыйскай) імперыі, стаў называцца Канстанцінопалем.

Калі Рымская імперыя была падзелена, Стамбул стаў сталіцай Усходняй Рымскай імперыі і быў названы Візантыяй у гонар яго першага заснавальніка Візаса.

Бейоглу размешчан амфітэатрам уздоўж паўночных берагоў Залатога Рога і прылягаючай да яго часткі Басфора. Паўднёвая частка горада вядома яшчэ і пад назвай Галата. Гэта партовая частка горада. Тут уздоўж узбярэжжа Залатога Рога і Басфора знаходзяцца партовыя ўстановы, тамажні, верфі і рамонтныя майстэрні, склады, некаторыя буйныя фабрыкі і заводы, магазіны і крамкі.

Цэнтральная ўнутраная частка Бейоглу, называемая Пера, складаецца з раду кварталаў—Таксім, Палгалты, Шышлі, Мачка і інш., забудаваных дамамі еўрапейскага тыпу. Тут размяшчаюцца канторы, банкі, магазіны, кватэры высокапастаўленых турэцкіх чыноўнікаў, капіталістаў і буйных памешчыкаў, а таксама еўрапейскіх дзяльцоў, замежныя консульствы, фешэнебельныя атэлі, рэстараны і г. д.

Галоўная вуліца Пера—Істэкляль джадэсі (вуліца незалежнасці). Далей на поўнач ад цэнтральнай унутранай часткі Бейоглу размешчаны больш старыя кварталы і прадмесці горада з вузкімі вуліцамі і невялікімі драўлянымі домікамі. Тут жывуць рамеснікі, рабочыя, служачыя і дробныя чыноўнікі.

Азіяцкая частка Стамбула называецца Ускюдар (69,7 тыс. жыхароў). Гэта тыповы турэцкі горад, населены рабочымі, рамеснікамі, дробнымі служачымі, чыноўнікамі і г. д. Сувязь паміж еўрапейскай і азіяцкай часткамі Стамбула ажыццяўляецца на невялікіх барках, паромах або лодках. Для перавозкі аўтатранспарту прыстасаваны самаходныя пантоны.

У 1920 годзе сталіца Турцыі была перанесена ў Анкару. Стамбулператварыўся ў акруговы цэнтр, але ён — найбольш буйны горад усёй Турцыі. У сучасны момант па турэцкіх даных насельніцтва яго складае больш 1.200 тыс. жыхароў. Гэта цэнтр гандлёвай дзейнасці розных маклераў, камісіянераў, спекулянтаў, арэна палітычных інтрыг і шпіянажу каланіяльных дзяржаў. Значэнне Стамбула вызначаецца яго палажэннем на стыку важных марскіх, сухапутных і водных шляхоў, яго роляй буйнага гандлёвага цэнтра і порта.

Тут сканцэнтравана вялікая частка тэкстыльнай прамысловасці Турцыі, ёсць некалькі буйных прадпрыемстваў харчовасмакавай прамысловасці, бойняў, піваварныя заводы, некалькі спіртаводачных заводаў, некалькі цэментных заводаў, завод металічных вырабаў, завод зборкі сельскагаспадарчых машын, фанерны завод і і нш. Ваенная прамысловасць прадстаўлена ў Стамбуле больш чым 10 даволі буйнымі спецыяльнымі заводамі. Большасць з іх сканцэнтравана галоўным чынам на ўскраінах горада і амаль усе яны належаць дзяржаве.

У горадзе многа буйных верфяў, дзе будуюцца і рамантуюцца судны, праводзіцца зборка падводных лодак. Ёсць і буйны аўтазборачны завод Форда, размешчаны ў асобнай «свабоднай зоне», якая карыстаецца экстэрытарыяльнасцю. Прадпрыемства займаецца мантажам аўтамабіляў, трактараў, самалётаў і танкаў.

Порт складаецца з трох частак—галацкай, унутранай і знешняй гавані. Галацкая гавань размешчана ў заліве Залаты Рог, які ўяўляе водную прастору даўжынёй у 7 кілометраў, шырынёй да 800 метраў і глыбінёю да 40 метраў. Збудаванні галацкага порта сканцэнтраваны паміж Галацкім мастом і Басфорам. Прыстані ёсць на паўночным і паўднёвым беразе Залатога Рога. Тут звычайна прыстаюць буксіры і параходы мясцовых зносін. Прычал на паўднёвым беразе звязан з веткай чыгункі станцыяй Сыркеджы. Буйныя судны, як правіла, стаяць на некаторай адлегласці ад прыстані. Пагрузачна-разгрузачныя аперацыі яны праводзяць пры дапамозе магун (тып баркі) і лодак.

На захад ад галацкай часткі размешчана ўнутраная гавань. Яна падзяляецца мастом Атацюрка на дзве часткі. На захад ад маста знаходзіцца ваенны марскі порт з пристанню даўжынёй каля 800 метраў. Паміж мастом Атацюрка і галацкай часткай размешчаны па абодвух берагах Залатога Рога прыстані, агульнай працягласцю ў 2 кілометры. Тут абслугоўваюцца судны, якія стаяць на рэйдзе. Збудаванні порта на еўрапейскай частцы знаходзяцца ў распараджэнні камісіі Абшчыны прыстаняў Галаты і Стамбула.

Агульнай асаблівасцю ўнутранай гавані з'яўляецца недахоп пагрузачна-разгрузачных сродкаў і складскіх памяшканняў. Знешняя гавань размешчана на поўдзень ад Галацкай. Яна прадназначана для суднаў з вогненебяспечным грузам.

На азіяцкім баку горада філіялам Стамбульскага порта з'яўляецца порт Хайдарпаша, які мае прыстань даўжынёй каля 400 метраў. Порт звязан са станцыяй Хайдарпаша Багдадскай магістраллю. У сучасны момант Стамбульскі порт рэканструіруецца за кошт крэдытаў Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця. Каля палавіны ўсіх камерцыйных аперацый краіны прыпадае на Стамбульскі порт.

**(працяг будзе)**

**Рэдактар А. ВОЛК.**

АТ 06742 Мінск. Друкарня Выдавецтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна. Зак. 702. Тыр. 2 000.